© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017



Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

МАСАВА-ПАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

Газета Слонімская

№45 (283) 7 — 13 лістапада 2002г. Наклад 11.800 экз. Кошт 320 руб.

«ГАЗЕТУ СЛОНІМСКУЮ» ЧЫТАЮЦЬ

Слонім, Зэльва, Дзятлава, Масты, Ваўкавыск, Шчучын, Ліда, Гродна, Баранавічы, іншыя гарады Беларусі, а таксама на HTTP://gs.promedia.by

ВЁСКА

ЖЫХАРОЎ МІЦЬКАВІЧ НАЙБОЛЬШ ХВАЛЮЕ ВЫПЛАТА ЗАРПЛАТЫ,

а не ўспамін пра тое, як некалі каля іх вёскі хацелі пабудаваць АЭС



Фота Віталя ГІЛЯ

Яшчэ ў 70-х гадах мінулага ўжо стагоддзя паміж вёскамі Ферадкі і Міцькавічы Слонімскага раёна, якія знаходзяцца ў пойме ракі Шчара, планавалася будаўніцтва атамнай электрастанцыі.

Працяг чытайце на 2 стар.

Курсы обмена валют в г. Слониме по состоянию на 10[00] 5.11.2002г.

	Покупка	Продажа
"Беларусбанк"		
1 USD	1885	1915
1 EURO	1840	1895
1 ZL	445	480
1 RUR	57	60
оао "Белпромстройбанк"		
1 USD	1885	1905
1 EURO	1840	1885
1 ZL	455	480
1 RUR	58	60
"Белагропромбанк"		
1 USD	1885	1905
1 EURO	1830	1865
1 RUR	57	60
Нацбанк РБ		
1 USD	1888	
1 EURO	1877,99	
1 RUR	59,42	

Магазин "ВСЕ ДЛЯ СТРОЙКИ И РЕМОНТА"
ВНИМАНИЕ! Продаём ЛИНОЛЕУМ
БОЛЕЕ 100 РАСЦВЕТОК
Цена за кв.м. от 7500 руб.
Тел. 2-30-00
Адрес: ул. Первомайская, д.3

Осуществляем поездки в г. Гродно
автобусом "Форд-Транзит" (15 мест).
Принимаем заказы на обслуживание коллективных мероприятий.
Запись по тел. 5-24-45.
Лиц. № 5-0482, 02.08.02г.-01.08.07г. МТК РБ

Организовываем поездки на а/м "Форд-Транзит" в ГРОДНО 15 мест.



Принимаем заявки по перевозке пассажиров по РБ.
Запись по тел.:
2-14-90 или 8-0296-78-09-72.
Лиц. № 5-0474, 15.07.02г.-14.07.04г. МТК РБ

Откройте мир вместе с нами!
1. Организовываем ЭКСКУРСИИ по Беларуси, в Польшу, Литву на комфортабельных автобусах



Volvo, (48+2)
Mercedes (49+2) мест
Принимаем заявки от организаций, школ и населения.
2. Организовываем ПОЕЗДКИ в г.МОСКВА (Черкизовский рынок) каждый понедельник.
3. Осуществляем Международные перевозки туристических групп, шоп-туров, групп для отдыха в курортные зоны Украины, Болгарии, Чехии.
8-0296-22-18-08
Лиц. № 5-0288 27.04.2001г.-26.04.2006г. МТК

РЭКЛАМА • • • РЭКЛАМА • • • РЭКЛАМА • • • РЭКЛАМА • • • РЭКЛАМА • • • РЭКЛАМА • • • РЭКЛАМА • • • РЭКЛАМА • • • РЭКЛАМА • • • РЭКЛАМА

Лиц № 30 от 30.11.99г. до 30.11.04г., СГИК
ТЕХНИКА для ДОМА И ОФИСА
2-15-30 г. Слоним, ул Советская, 8

Доп. к лиц. №2, 24.04.2002г.-30.11.2004г. СГИК
Магазин ВСЕ ДЛЯ СТРОЙКИ И РЕМОНТА
2-30-00 г. Слоним, ул. Первомайская, д.3.

РАДИОТАКСИ "Экспресс" теперь и в сети Velcom
(8-029)-644-13-12
Лиц. СГИК №0019614, 26.11.98-26.11.02.

Автобусом в Белосток
за покупками каждый четверг.
Тел. 4-61-92, 8-02962-5-21-06.
Лиц. АК №5-0327 от 14.03.2002г. МтикРБ

ПОСТОЯННО ОРГАНИЗОВЫВАЕМ ПОЕЗДКИ НА АВТОБУСАХ Форд-Транзит, Мерседес-Спринтер (15 мест)
ГРОДНО Пышки Рынок Центр 513-67
МИНСК Медицинский институт Институт культуры Центр 222-99, 219-52, 8-0296-551499
ПОЕЗДКИ ПО РБ: 222-99, 8-0296-574024 ПРЕВРАТИ СВОЮ ПОЕЗДКУ в маленькое ПУТЕШЕСТВИЕ

в г. ГРОДНО и в г. МИНСК ЕЖЕДНЕВНО тел. 8-0296-20-32-70 тел. 44-2-88
Лиц. №5-0196, 25.02.98-25.02.03, МТК РБ

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

ВЁСКА

ЖЫХАРОЎ МІЦЬКАВІЧ НАЙБОЛЬШ ХВАЛЮЕ ВЫПЛАТА ЗАРПЛАТЫ,

а не ўспамін пра тое, як некалі каля іх вёскі хацелі пабудаваць АЭС



Тут павінны былі пабудаваць АЭС

Фота Віталя ГІЛЯ

(Працяг. Пачатак на 1 стар.)

Толькі па шчаслівай выпадковасці лёс мінаваў Слонімшчыну ад такой навалы. У той час пачалося будаўніцтва Ігналінскай АЭС. Таму на гадоў пятнаццаць забыліся пра гэтае месца. Але ў 1990 годзе ў Слонім зноў пачалі прыязджаць энергетыкі з Масквы і з Мінска. На гэты раз яны планавалі размясціць тут цеплавую электрастанцыю. Але былы старшыня Слонімскага райвыканкама Станіслаў Здановіч неяк адбіўся ад той будоўлі. Галоўным архітэктарам раёна на той час працаваў Яўген Бялевіч. Вось што ён сёння сказаў на гэты конт: "Любая электрастанцыя патрабуе вялікай колькасці вады для ахалоджвання цепланасіцеляў. Для гэтага неабходна было б стварыць вялікую колькасць азёр. У выніку чаго падняўся б узровень Шчары і Ісы, а таксама грунтовых вод, і вядома ж парушыўся б стан фауны і флоры ў наваколлі. Таму спыніліся на Зэльвенскім вадасховішчы, а Слонімшчыну пакінулі ў спакоі. Дарэчы, у тыя 70-гады размова аб АЭС не ішла, а толькі тэрыторыя каля Міцькавіч увайходзіла ў схему мясцін, дзе ў былым СССР маглі б пабудаваць атамную электрастанцыю. Хаця ў той час у любы момант паўсталі б пытанні і аб пабудове АЭС," — сказаў Яўген Бялевіч.

Карэспандэнты "ГС" вырашылі праверыць: ці ведаюць і памятаюць жыхары вёскі Міцькавічы аб тым, што побач з іх вёскаю планавалі некалі пабудаваць атамную электрастанцыю і зрабіць іх вёску вядомаю на ўвесь свет? Пад'язджаючы да вёскі, нашу рэдакцыйную машыну атакавалі мясцовыя сабакі. На іх брэх выйшла з хаты Марыя Цімафееўна Дэйка. "Адкуль у вашай вёсцы столькі сабак?" — запыталіся мы ў Марыі Цімафееўны. "Сабак у нас многа, а вось жыхароў зусім мала стала. Ды і сабакі не нашы, едуць людзі па шасэ і выпускаюць з машын сваіх хатніх жывёл. Відаць, карміць няма ўжо чым. Вось тут і бегаюць зграямі", — сказала жанчына. А наконт таго, ці чула яна пра электрастанцыю — сказала, што не , але чула пра газаправод Ямал-Еўропа, бо ён праходзіць за вёскаю.

Да нашай гутаркі далучыліся іншыя вяскоўцы. Пенсіянер, былы калгасны шафёр Анатоль Уладзіміравіч Дэйка, памятае той час, калі ў Міцькавічах гаварылі пра будаўніцтва электрастанцыі. А Васіль



Уладзіміру Чабатарэнку і яго равеснікам жывецца сумна, бо ў вёсцы не хапае маладзіц

Фота Віталя ГІЛЯ



Сабакі надзейна ахоўваюць хату Марыі Цімафееўны Дэйка

Фота Віталя ГІЛЯ

Дэйка і Уладзімір Чабатарэнка нават маюць пасведчанні чарнобыльцаў, бо год працавалі ў Хойніцкім раёне. "Штогод нам павінны даваць бясплатна пуцёўкі ў дамы адпачынку. Але мы ездзім не мацаваць здароўе, а штодзённа на калгасную ферму і дадому. Аднак за нашу працу старшыня калгаса ўжо чатыры месяцы не дае зарплату", — сказаў Уладзімір Чабатарэнка.

Пра затрымку зарплаты гаварылі ўсе вяскоўцы. А адна маладая жанчына ледзь не заплакала ад крыўды: "У мяне трое дзяцей, старэйшая дачка вучыцца ў Гродне, а калі прыедзе дамоў — няма нават грошай даць ёй на білет. Як нам быць?"

І, сапраўды, што рабіць вяскоўцам без рубля ў кішэні? І тыя мужчыны, якія ў Міцькавічах працуюць падвозчыкамі на мясцовай ферме, за чатыры месяцы павінны атрымаць, як яны сказалі, дзесьці 280 тысяч рублёў. Але і гэтай сумы калгас ім не выплочвае.

У час сустрэчы жыхары Міцькавіч паказалі нам былы мясцовы клуб, які даўно апусцеў. Няма ў вёсцы бібліятэкі, няма магазіна."Цяпер у вёсцы пражывае пятнаццаць дзяцей, якія штодзённа ездзяць вучыцца ў Навасёлкаўскую школу. А хацелася б, каб у роднай вёсцы для іх была б невялікая бібліятэка, а то няма ў вольны час чым дзецям заняцца і што пачытаць", — гаварылі мясцовыя кабеты. Адзінае, чым былі задаволены вяскоўцы, дык гэта аўталаўкаю, з якою да іх два разы на тыдзень прыязджае Міхаіл Януш. Шмат добрых і шчырых слоў гучала ад вяскоўцаў у адрас гэтага чалавека.

Гаварылі міцькаўчане і пра электрастанцыю. Вельмі яны шкадуюць, што яе пабудавалі ў Ігналінску, а не ў Міцькавічах, на парэцкім выгане. " І быў бы ў нас ужо пасёлак Міцькавічы, а не забытая Богам і людзьмі вёсачка. І гаварылі б усе пра Міцькавіцкую АЭС", — жартавалі з намі мясцовыя абарыгены. А калі мы пакідалі вёску, у вачах і на тварах людзей адчуваўся нейкі горкі адчай, няўцешны смутак і адзінота.

Сяргей ЧЫГРЫН

ЗДАРЭННІ

ВЫВЕЗЛІ З ХЛЕБАЗАВОДА

29 кастрычніка работнікі слонімскай міліцыі затрымалі аўтамабіль.

На ім без адпаведных дакументаў работнікі мясцовага хлебазавода везлі са свайго прадпрыемства неабходныя для выпечкі хлеба прадукты.

Па дадзенаму факту ўзбуджана крымінальная справа.

КРАДЗЕЖ НА ТАПАЛЁВАЙ

30 кастрычніка з кватэры жанчыны, якая жыве на Тапалёвай вуліцы ў Слоніме, зніклі грошы.

Па факту крадзяжу ўзбуджана крымінальная справа.

УЦЯКЛІ З ДОМУ

На мінулым тыдні чацвёра слонімскіх падлеткаў без ведама бацькоў пакінулі родны горад і адправіліся ў вандроўку.

Дваіх уцекачоў міліцыя затрымала ў Мінскай вобласці, а двое другіх вярнуліся дамоў самастойна.

Мікола КАНАНОВІЧ

АВТОМОБИЛЬ НЕ ПОСТРАДАЛ

В воскресенье, 3 ноября, на 1-м Лесном переулке в Слониме загорелся гараж.

От огня удалось спасти автомобиль "Форд-Сиерра".

Причина пожара устанавливается.

СНАРЯДЫ ВОЗЛЕ НЕФТЕБАЗЫ



Фота Віталя ГІЛЯ

В понедельник, 4 ноября, возле Слонимской нефтебазы, недалеко от Лабазовского озера, сотрудниками милиции были найдены три 125-мм учебных танковых снаряда.

Как отметил сапер 11-й отдельной механизированной бригады Владимир Лямзин, эта "находка" не опасна для людей, так как снаряды наполнены песком.

Ольга ШИНКЕВИЧ

Беларуская служба
Радыё Свабода
Чэхія:
Vinohradska 1, Praha 11000 CZ
Беларусь:
п/с 111, Менск, 220005
Інтэрнэт:
www.svaboda.org
RADIO FREE EUROPE
RADIO LIBERTY

час	kHz	хвалі
18:00-20:00	7190	41
	9615	31
	15460	19
	612 і 1188	сярэднія хвалі
20:00-22:00	6140	49
	7205	41
	9865	31
	612	сярэднія хвалі
22:00-24:00	6140	49
	7205/6010	41
	9845	31
	612 і 1188	сярэднія хвалі
06:00-08:00	6140	49
	9615	31
	9835	31
	612 і 1188	сярэднія хвалі


Настройцеся на Свабоду!

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

ФОТОРЕПОРТАЖ

УЧИЛИСЬ ЛИКВИДИРОВАТЬ АВАРИИ



Территорию "аварии" нужно залить водой, чтобы охладить землю

29 октября, во вторник, на автомобильной стоянке возле деревни Чемеры Слонимского района проходили специализированные областные учения по ликвидации чрезвычайных ситуаций на магистральном газопроводе.

В учениях приняли участие местный отдел КГБ, скорая помощь, районный узел связи, милиция. Собравшиеся отрабатывали свои действия при возможной аварии на линии магистрального газопровода.

Ольга ШИНКЕВИЧ



Машина с людьми по сценарию пострадала от взрыва



Спасение раненых



Устранение аварии на газопроводе

ПАШЧАСЦІЛА

ЛІСТАПАДАЎСКІ ЎЛОЎ

1 лістапада слонімскія падлеткі Анатоль Світа і Іван Чура пабывалі на рыбалцы на возеры ў вёсцы Дзераўная Слонімскага раёна. Сачком каля берага хлопцы злавілі два карпы, агульнай вагой 14 кг 800 г. Адна рыбіна важыла 8 кілаграмаў, а другая — 6 кг 800 г.

У той дзень такім чынам рыбачылі не толькі гэтыя хлопцы. На дзераўноўскае возера прыйшлі і прыехалі многія, хто даведаўся, што ваду з яго будуць спускаць, каб пачысціць вадаём. Праблема малых азёраў і сажалак у тым, што яны хутка зарастаюць водарасцямі і становяцца непрыгоднымі для рыбалкі. Аднак вельмі рэдка ў наш час іх бяруцца чысціць, бо для гэтага патрэбны сродкі і спецыяльная тэхніка. А ў калгасах, на тэрыторыі якіх знаходзяцца такія вадаёмы, і сваю тэхніку, бывае, няма чым заправіць, каб своечасова ўзараць поле.

Дзераўноўскае возера, па словах рыбакоў, зарасло так, што не было куды закінуць вуду. А калі адкрылі застаўкі, то водарасці зрабілі затор, і вада адразу не пайшла — прыйшлося ачышчаць зліў уручную. Калі вада збольшага сышла — рыбакі ўзяліся за справу.



Анатоль Світа і Іван Чура са сваім уловам

Цяпер, пакуль возера пачысцяць, парамантуюць ставы, запоўняць вадой і зноў запусцяць рыбу — пройдзе шмат часу. Таму, у пэўным сэнсе, гэтая лістападаўская рыбалка на дзераўноўскам возеры была апошняй.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЦЕНЫ

БЕНЗИН ДЛЯ БЕЛОРУССКОГО АВТОЛЮБИТЕЛЯ


Ознакомьтесь с таблицей и сами делайте вывод. Заметим лишь, что он у нас дороже, чем в России. А на свою среднемесячную зарплату белорус может приобрести его значительно меньше, чем граждане соседних стран.

Страна	Стоимость 1 литра бензина марки А-95 (в белорусских рублях)	Сколько можно купить на среднемесячный доход (литров)
Россия	657,2	310
Латвия,Литва	1292	400
Польша	1503	440
Чехия	1743	470
Италия	1984	1500
Германия	2044	1800
Франция	1924	1830
Швеция	1984	2000
Дания	2104	2400
Швейцария	1684	3620
Англия	2225	3650
Беларусь	968,1	219

И СМЕХ, И ГРЕХ

ХОТИТЕ 100 ДОЛЛАРОВ — ПРОДАЙТЕ КОРОВУ

Днями в редакцию "Газеты Слонімскай" позвонил мужчина и рассказал о том, как его мать, Вера Петровна Шишко из деревни Бойки, сдавала на Слонимский мясокомбинат свою кормилицу-коровку.



За меня 100$?!

Значит, завесила буренка живым весом на 440 килограммов, сбросили на комбинате этот вес до четырехсот двадцати семи, — на рога там, голову. И выписали квитанцию на сумму аж в 187 тысяч рублей. 100 долларов США, примерно, получается. А за килограмм выходит где-то 438 белорусских рублей.

А теперь зайдем в ближайший продуктовый магазин и посмотрим, сколько стоит то, что от этой коровки лежит на прилавке. Итак, говядина: тазобедренная часть — 7 645 рублей, грудная часть — 5 290 рублей, язык — 7 025 рублей, полуфабрикат для пирожков — 2 069 рублей, ноги — 430 рублей, кость для зверей — 130 рублей (все цены, естественно, за 1 килограмм).

Выходит, продала бабушка свою корову по цене копыт говяжьих. Что ж удивляться бедственному положению нашего сельского хозяйства, когда закупочные цены такие смешные. Да и деньги-то эти вам сразу получить не удастся. Вере Петровне на мясокомбинате посоветовали звонить изредка; будут деньги — выплатят.

P.S. В сырьевом отделе Слонимского мясокомбината корреспонденту "ГС" сообщили, что расценки при приеме крупного рогатого скота на мясо живым весом колеблются от 1 706 рублей до 438 рублей за килограмм, в зависимости от упитанности животного.

Валерий КОВАЛЕНКО

НАВІНА

"БУДУЕМ СВЕТ, ПРЫДАТНЫ ДЛЯ ЖЫЦЦЯ ДЗЯЦЕЙ"

Абласная дзіцячая канферэнцыя пад такой назвай 1 і 2 лістапада прайшла ў Гродне. У ёй прымалі ўдзел лідэры дзіцячых ініцыятыў і грамадскіх арганізацый вобласці.

Са Слоніма на гэтую канферэнцыю паехаў старшыня дзіцячага грамадскага аб'яднання "Вятрак" Алег Шэлестаў.

А з 3-га па 6-га лістапада ў Мінску пад такой назвай працавала Нацыянальная канферэнцыя дзіцячых лідэраў. Яе арганізатарамі выступілі Беларускі саюз моладзевых і дзіцячых грамадскіх аб'яднанняў "РАДА" сумесна з прадстаўніцтвам дзіцячага фонда ААН у Беларусі.

Як паведамляе інфармацыйнае агенства БелаПАН, у працы канферэнцыі прынялі ўдзел каля ста юных лідэраў дзіцячых грамадскіх аб'яднанняў з усіх куткоў Беларусі. У канферэнцыі ўдзельнічалі таксама прадстаўнікі органаў дзяржаўнай улады і кіравання, ААН, ЮНІСЭФ.

Падчас працы яе ўдзельнікі абмеркавалі выніковыя дакументы Спецыяльнай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у інтарэсах дзяцей, якая прайшла ў траўні бягучага года, і распрацавалі прапановы ў Нацыянальны план дзеянняў Рэспублікі Беларусь у адносінах дзяцей на аснове прыярытэтаў, абвешчаных сусветным супольніцтвам.

У Нацыянальнай дзіцячай канферэнцыі "Будуем свет, прыдатны для жыцця дзяцей" таксама браў удзел лідэр "Ветрака" з вёскі Мірная Слонімскага раёна Алег Шэлестаў.

Мікола КАНАНОВІЧ

ПРАФСАЮЗЫ

НОВАЕ — НЕ ЗАБЫТАЕ СТАРОЕ

Члены прафсаюзаў прадпрыемстваў і ўстаноў Слонімшчыны, пасля дзевяцімесячнай аплаты наяўнасцю, зноў пераходзяць на безнаяўнае пералічэнне прафсаюзных узносаў.

Як паведамілі карэспандэнту "ГС" у прафкаме галіновага прафсаюза работнікаў адукацыі, усе 2485 іх сяброў з 1 верасня перайшлі на безнаяўную форму аплаты членскіх узносаў. Дарэчы, не ўваходзяць у прафсаюз і, адпаведна, не плоцяць узносы каля 100 слонімскіх педагогаў.

На Слонімскім вінзаводзе 185 работнікаў. Яны ўсе з'яўляюцца членамі прафсаюза, і ўсе без выключэння напісалі заявы, каб, як і раней, плаціць прафсаюзныя ўзносы па пералічэнню.

Такая ж карціна назіраецца і на Слонімскім кардонна-папяровым заводзе, дзе працуе 1800 чалавек, і амаль усе яны ўваходзяць у прафсаюз.

Людзі зацікаўленыя ў безнаяўным пералічэнні грошай на прафсаюзны рахунак таму, што такім чынам яны не стаяць перад неабходнасцю развітвацца з жывымі грашамі з кашалька.

Паказальнай у гэтым плане з'яўляецца сітуацыя на гродзенскім прадпрыемстве "Азот", пра якую паведамляла агенства БелаПАН са спасылкай на старшыню прафкама "афіцыйнага" прафсаюза Міхаіла Малевіча. Па яго словах, за 9 месяцаў, пакуль не дзейнічаў безнаяўны парадак пералічэння, узносы перасталі плаціць каля 20 працэнтаў членаў прафсаюза, а частка людзей перайшла ў незалежны прафсаюз.

Такім чынам, пастанова Савета міністраў у пачатку года аб адмене безнаяўнага пералічэння прафсаюзных узносаў аказалася нежыццядзейнай.

Прафсаюзы вярнуліся да старой, традыцыйнай формы збору членскіх узносаў.

Мікола КАНАНОВІЧ

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

ГОСТИ

УСТРОИМ ЦИРК ДОМА

В "Газету Слонімскую" позвонила мать пятерых детей, которая попросила не указывать свою фамилию, и рассказала следующее:

"Как известно, в Слоним приехал цирк, который развернул свой шатер в районе газопровода, недалеко от СШ №3. И моим детям, как впрочем и всем другим, в школе дали бесплатные билеты на представление. Ребята, обрадовавшись такому везению, вприпрыжку побежали в цирк. А их туда не пустили, мотивируя все происходящее тем, что с каждым ребенком должен прийти взрослый. А билет для взрослого человека стоит 7 тысяч рублей. Вот такая "благотворительность" получается. Дети очень расстроились, а самый младший сказал: "Придется дома самим цирк устраивать".

И еще одна жалоба по поводу цирка поступила от слонимчанина С., у которого два сына. И вот старший 14-летний сын, выиграв билет в лотерею в школе, пошел на представление в цирк. А его, по уже известному сценарию, не пустили. Опять-таки: не было взрослого рядом. Тогда подросток решил купить билет, чтобы все-таки попасть на представление, но в кассе ответили, что билетов нет. "Вот и получается, что ребенок с билетом не попал в цирк", — сказал С.

За комментариями по этим жалобам корреспондент "ГС" обратилась к администрации интернационального цирка.

"Да, мы действительно не пускаем детей в цирк без сопровождения взрослых. У нас и так получается, что 60% билетов – бесплатные. В местном райисполкоме есть списки многодетных семей, которые передали нам. И мы пошли на уступки, поэтому дети из этих семей могут прийти на представление совершенно бесплатно в сопровождении одного взрослого.

А народ начинает наглеть: приводит одна женщина несколько детей и просит, чтобы их всех пропустили без сопровождения. Мы говорим, что на каждого ребенка должен быть взрослый человек. Женщина – в крик, говорит, что это все ее дети. Стали выяснять, и оказалось, что она с собой привела еще и соседских ребят.

Поэтому, мне кажется, что не стоит обижаться на то, что у нас такие условия: один взрослый (билет для него будет платным) может бесплатно провести с собой одного ребенка".

Ольга ШИНКЕВИЧ

К НАПЕЧАТАННОМУ

БАБЕ МАНЕ ПОМОЖЕТ КОЛХОЗ

«Кто поможет бабе Мане?» — под таким заголовком в одном из номеров «ГС» был опубликован материал о жилищных условиях семьи Стасюкевичей из деревни Костровичи. Что же изменилось с момента публикации, и чем смогли помочь Марии Петровне в её беде?


Как отметил в телефонном разговоре председатель колхоза «1-е Мая» Антон Добренко, крыша данного дома по улице Мира, 41, где проживает Стасюкевич, уже ремонтировалась. Колхоз в ближайшее время найдёт возможность почистить и отремонтировать печь, а вот с ремонтом и заменой труб отопления в доме придётся повременить.

Виктор ГЕРАСИМЧИК, депутат Слонимского райсовета

ГОРАД

ДАРОГІ ВЫПРАБАВАННЯЎ

Днямі ў рэдакцыю "ГС" прыйшоў ліст-зварот, у якім жыхары вуліц Ф.Скарыны, Брэсцкай і праспекта Незалежнасці расказваюць пра агульныя беды.



Па такой вуліцы не праехаць, не прайсці

Фота Віталя ГІЛЯ

"Мы, жыхары вуліц Ф.Скарыны, Брэсцкай і праспекта Незалежнасці г.Слоніма, звяртаемся да вас з даўно набалелай праблемай. У нашым мікраараёне пешаходныя дарожкі і аўтадарогі, прылягаючыя да нашых дамоў, даўно ператварыліся ў дарогі выпрабаванняў. А па пешаходных дарожках немагчыма хадзіць з-за ям і выступаючых каменняў, што прыводзіць да псавання абутку і калецтва.

Асабліва нас непакоіць, што з-за няякасных дарог траўміруюцца нашы дзеці.

Акрамя гэтага, звяртаем вашу ўвагу на непрыглядны выгляд пад'ездаў нашых дамоў, стан дзіцячых пляцовак, рамонтам і добраўпарадкаваннем якіх ужо працяглы час ніхто не займаецца, а таксама на недастатковае асвятленне нашага мікраараёна.

Таму патрабуем неадкладна заняцца вырашэннем дадзенай праблемы, звязанай з рамонтам і добраўпарадкаваннем пешаходных дарожак, аўтадарог, пад'ездаў нашых дамоў, дзіцячых пляцовак і асвятлення."

Пад гэтым зваротам, накіраваным, акрамя нашай газеты, у Слонімскі райвыканкам, ЖЭС-2 г.Слоніма, Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь, а таксама ў рэдакцыю газеты "Слонімскі веснік", падпісаліся 152 жыхары названых вуліц.

Ініцыятарам збору подпісаў выступіла Слонімскае раённае грамадскае аб'яднанне БНФ "Адраджэнне".

Трэба адзначыць, што скаргі на дрэнныя дарогі і неўладкаванасць двароў у жылым сектары Слоніма паступаюць ў рэдакцыю газеты досыць часта, і пад такім зваротам маглі б падпісацца жыхары ці не кожнага гарадскога мікраараёна.

Ведаем пра жудасны стан спраў з вуліцамі і дырэктар жыллёва-камунальнай гаспадаркі Слоніма Канстанцін Зубко. Як паведаміў ён карэспандэнту "ГС", у гэтым годзе рамонтныя работы праводзіцца не будуць. А на наступны год рыхтуецца дакументацыя на аднаўленне вуліц і тратуараў у раёне ад даўгабуда па Брэсцкай вуліцы і ўніз па вуліцы Ф. Скарыны і праспекту Незалежнасці.

Дарэчы, Савет міністраў Беларусі прыняў рашэнне аб правядзенні з 1 лістапада месячніка навядзення парадку. Ды толькі ў Слоніме на гэты месячнік нічога не запланавана.

Відаць, сапраўды, прыйдзецца чакаць да наступнага года, які Лукашэнка прапанаваў аб'явіць годам добраўпарадкавання, чысціні і парадку. А пакуль што, запасайцеся добрым абуткам ды беражыце ногі.

Мікола КАНАНОВІЧ, Валерый КАВАЛЕНКА

ДОБРО ПОЖАЛОВАТЬСЯ

"ДОБРО ПОЖАЛОВАТЬСЯ" В "ГС"

Уважаемые читатели, с сегодняшнего номера наша газета открывает новую рубрику под названием "Добро пожаловаться".

Если у вас, уважаемые читатели, возникают проблемы, которые вы не в состоянии решить сами, если с вами в той или иной ситуации обошлись некорректно, пишите нам по адресу: 231800, Слоним, ул. Комсомольская, 8 с пометкой: в "Добро пожаловаться" (обязательно указывайте свою фамилию, имя и контактный телефон), или звоните по телефону: 4-79-34. Журналисты "ГС" вас всегда выслушают и постараются помочь. Вместе мы постараемся решить ваши проблемы.

В сегодняшнем номере рубрику "Добро пожаловаться" открывают жильцы дома №26 по улице 1-й Семилетки, а в частности Галина Ивановна Нестер, которая написала в "ГС" письмо.

Галина Ивановна в своем письме отмечает, что их дому уже 11 лет «и мы все никак не можем устранить недоделки: то крыша течет, то вода в подвале 1-го подъезда уже шесть лет стоит".

И, как обычно бывает в таких случаях, люди начинают жаловаться чиновникам, ответственным лицам. В ответ зачастую слышат одни лишь обещания.

"Я много раз обращалась к мастеру ЖЭС-1 Тимофееву, однако, он только обещает все сделать, а на самом деле работа с места не двигается", — пишет Галина Ивановна.

А еще, по словам женщины, начальник ЖЭС-1 Сергей Барбутько предложил Галине Ивановне за свои деньги купить замазку, чтобы заделать "швы" на фасаде доме. "Я же перечисляю деньги за капитальный ремонт, — возмущается Галина Нестер, — почему я должна ещё за свои деньги покупать какую-то замазку?".

Вот таким образом и решаются проблемы жителей 26 дома по ул. 1-й Семилетки на протяжении 11 лет. И, к сожалению, почти всегда безуспешно.

Да и вода горячая появилась в доме только на два дня в начале октября. И то, как говорит Галина Ивановна, только поздно вечером и то чуть теплая.

На претензии Галины Ивановны отвечает начальник ЖЭС-1 Сергей Митрофанович Барбутько:

— Наше предприятие недавно сделало капитальный ремонт крыши 26 дома. Поэтому никаких проблем с ее протеканием нет. Мы успешно решили этот вопрос.

По поводу воды в подвале 1-го подъезда лично ко мне никто не обращался, следовательно, я не знал про эту проблему. Может быть, там под домом проходят грунтовые воды.

А что касается моего предложения Галине Ивановне купить замазку, и только тогда рабочие нашего ЖЭСа заделают "швы" дома, так это правда.

На тот момент, когда женщина обращалась в ЖЭС, материалов на ремонт не было, поэтому, чтобы ускорить процесс, я предложил ей самой купить все необходимое для ремонта. К сожалению, так складывается: либо ждите, когда у нас появятся материалы, либо сами их покупайте, а мы выполним работу.

У нас, как сейчас на любом предприятии, хватает проблем, но мы стараемся их быстро решать. Я уверяю вас, что постараюсь еще раз разобраться с проблемами жильцов 26 дома по улице 1-й Семилетки.

Ведущая рубрики Ольга ШИНКЕВИЧ

НАШ БЫТ

ОТЧЁТ КОМЕНДАНТА ДОМА

Я живу в Альбертине. Весною этого года меня избрали комендантом дома №22 по улице Первой Семилетки.

Полгода работая на общественных началах, я пришёл к выводу, что красота нашего города, наших микрорайонов, улиц и дворов, домов зависит , в первую очередь, от самих жителей города, домоуправлений и милиции. Но, к сожалению, всё не так, как хотелось бы. Приведу примеры по Альбертину.

Автобусная остановка «Микрорайон» уже столько лет без вечернего освещения. Нет его и около домов №№22,24 по улице Первой Семилетки, а ведь рядом лес. Домоуправление не выполнило своё весеннее обещание — разобрать сломанный арматурный шар с детской площадки.

С жителями микрорайона ни милиция, ни домоуправление не работают. Никак не дождусь я встречи с инспектором ИДН, чтобы провести занятие с детьми. Хулиганство в Альбертине процветает. Бесследно исчезли с улицы Минский тракт несколько знаков «Ограничение скорости». Около магазинов «Исса», "Звёздный" толпами ходят молодые «опивоши», выпрашивают у людей деньги. А не дашь, изобьют. С 1996 года в нашем посёлке отсутствует милицейское патрулирование.

Замки у входа на крышу дома жители ломают, устанавливают на рубероидной крыше телеантенны, летом устраивают места отдыха с водкой и селедкой, загорают. Домоуправление знает обо всём этом, но мер не принимает. На его многочисленные объявления об освобождении от грядок территории домоуправления жители не реагируют. Ещё весной я просил у домоуправа двух рабочих, чтобы благоустроить территорию, но это так и осталось невыполненным.

21 сентября я наметил провести субботник по благоустройству территории, однако, несмотря на объявление, пришло всего два человека.

Вот так мы заботимся о месте, где живем.

Георгий МОСКОВЧУК

У НАШЫХ СУСЕДЗЯЎ

СЛОНІМСКАЯ ВУЛІЦА Ў БЕЛАСТОКУ

У Польшчы ў горадзе Беластоку ёсць Слонімская вуліца. У архіве гэтага горада зберагліся натарыяльныя запісы.

З іх мне ўдалося даведацца, што раней Слонімская вуліца называлася Гогалеўская. Але 17 красавіка 1919 года часовым гарадскім камітэтам яна была перайменавана ў Слонімскую вуліцу.

"Gazeta sasiedzka", якая выдаецца ў Беластоку, нядаўна апублікавала артыкул "Ulica Slonimska". З яго можна даведацца, што раней на Слонімскай вуліцы ў Беластоку былі рынак з вадапоем для коней, лазня, рэзідэнцыя графа, дом манахаў з семінарыяй, пякарня, пошта і г.д.

Сёння Слонімская вуліца налічвае 56 дамоў. На ёй знаходзяцца крамы, аптэка, касметычны салон, паліклініка, аўтамайстэрня, рэстаран "Сем спакусаў" з летнім піўбарам. Яна пачынаецца ад мясцовага гарвыканкама сучасным будынкамі і заканчваецца аднапавярховымі дамамі.

Уладзімір АЛЬХОВІК

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

ВОЛКОВЫСК

У СОЛИДНОЙ ФИРМЫ — ФИРМЕННАЯ ПЕЧАТЬ

Герб города Волковыска и Волковысского района вскоре появится на печати частного предпринимателя, участника афганских событий Николая Автуховича.

Райисполком дал на это разрешение, учитывая чётко налаженную работу его предприятия по перевозке пассажиров и грузов, а также активное участие в благотворительной деятельности.

ДЛЯ ЖЕНЩИН — ДОМАШНЕЕ ХОЗЯЙСТВО

Ни одной вакансии для женщин не было заявлено организациями района на конец октября текущего года.

Похоже, что безработица в Волковысском районе всё больше приобретает женское лицо. Теперь на учёте в Центре занятости числится около семисот женщин.

Наиболее дефицитная специальность для них — бухгалтер. Особые сложности испытывают женщины со средним специальным образованием и не имеющие никакой специальности.

НЕЗАКОННАЯ СДЕЛКА

Могилевчанин К. приобрёл на Гродненском авторынке у жителя Волковыска автомобиль «Опель-Кадет» по генеральной доверенности.

При перерегистрации машины выяснилось, что у неё переварен номер кузова и перебит номер двигателя.

В отношении продавца возбуждено уголовное дело.

НЕСЧАСТНЫЙ СЛУЧАЙ

На крыше четырёхэтажного здания учебного корпуса сельхозколледжа бригада сельторгстроя проводила ремонт кровли.

Принимая газовый баллон, один из рабочих не удержался и упал на землю. Спустя некоторое время он скончался в хирургическом отделении Волковысского ТМО.

Александр ДАНИЛИН

ЗЭЛЬВА

ВОСЕНЬСКІ КІРМАШ

У нядзелю, 3 лістапада, на цэнтральным рынку Зэльвы адбыўся традыцыйны восеньскі кірмаш. Сельскія гаспадаркі раёна рэалізоўвалі зэльвенцам прадукцыю жывёлагадоўлі і раслінаводства.

У кірмашы таксама прымалі ўдзел раённае спажывецкае таварыства, трыкатажная фабрыка "Зальвянка" і іншыя прадпрыемствы.

Тут жа праходзілі выставы твораў народных умельцаў і сельскагаспадарчай тэхнікі, якую маюць калгасы раёна.

А падтрымліваў святочны настрой жыхароў пасёлка ансамбль "Люба-дарага", выступленне якога праходзіла на цэнтральным рынку.

Наталля ГЛУШЭНЯ

УДАКЛАДНЕННЕ

У мінулым нумары (№ 44) "Газеты Слонімскай" была змешчана заметка пад назвай "Памерці не атрымалася", у якой паведамлялася, што ў вёсцы Князева Зэльвенскага раёна мясцовая 32-гадовая жыхарка спрабавала скончыць жыццё самагубствам, але яе удалося выратаваць. Аднак, як стала вядома рэдакцыі, на жаль жанчына памерла.

ПАМЯНУЛІ ПРОДКАЎ



Фота IREX/ProMedia

У мінулую суботу ў Беларусі адзначылі асеннія Дзяды. Тысячы людзей наведалі могілкі сваіх продкаў, усклалі на магілы кветкі і ўстанавілі крыжы.

ЗЭЛЬВА

ДАПАМОГА ДЛЯ МАЛАЗАБЯСПЕЧАНЫХ

Да нядаўняга часу гуманітарную дапамогу пры касцёле вёскі Дзярэчын маглі атрымаць усе жадаючыя.

Цяпер дапамога выдаецца толькі малазабяспечаным людзям і выключна па даведках з сельскіх Саветаў ці райсабеса.

КАЛГАСАМ НЕ ХАПАЕ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Па дадзеных Зэльвенскага цэнтра занятасці, на пачатак кастрычніка гэтага года незапатрабаванымі былі 148 рабочых месцаў.

У сельскіх гаспадарках раёна не хапае заатэхнікаў, ветэрынараў, жывёлаводаў, аграномаў, даярак. Асноўныя прычыны такіх вакансій — невялікая зарплата і непрэстыжнасць прафесіі.

Наталля ГЛУШЭНЯ

МАСТЫ

МІЛІЦЫЯ ПРАЯВІЛА ІНІЦЫЯТЫВУ

Мастоўскі райаддзел унутраных спраў у апошні час мае вялікі клопат з павелічэннем крадзяжоў з кватэр, угонам і разукамплектаваннем аўтамашын.

Дзеля таго, каб папраўвіць становішча, кіраўніцтвам аддзела было прынята рашэнне абмеркаваць гэтую праблему сумесна з гараджанамі.

На працягу некалькіх дзён супрацоўнікі міліцыі сумесна з кіраўніцтвам раённага аб'яднання "Ахова" мелі шэраг сустрэч з жыхарамі высотных дамоў горада. Меравіта тут надараецца большасць падобных правапарушэнняў. Нягледзячы на тое, што сустрэчы адбываліся ў позні час, людзі былі зацікаўленыя ў абмеркаванні падобных праблем. Прысутныя выказвалі прэтэнзіі камунальным службам, кіраўніцтву горада, скардзіліся на адсутнасць аховы на аўтамабільных стаянках.

З міліцэйскага начальства на сустрэчы прысутнічалі намеснік начальніка РАУС маёр Юрэня, начальнік ДАІ маёр Палубятка, начальнік раённага аб'яднання "Ахова" маёр Крофта і іншыя. Яны звярталі ўвагу людзей на тое, што вырашэнне многіх праблемаў залежыць ад іх саміх»надзейнасць замкоў у падвалах, уваходных дзвярэй у кватэрах і г.д. Зацікаўленым былі прапанаваны паслугі аб'яднання "Ахова", у тым ліку ўзяцце пад сігналізацыю кватэраў.

Як прадстаўнікі міліцыі, так і грамадзяне аднадушна пагадзіліся з тым, што ў горадзе неабходна ахоўваемая аўтамабільная стаянка. Аўтамабілі на ёй будуць у бяспецы, а двары жылых дамоў пазбавяцца, нарэшце, ад перагружанасці аўтатранспартам.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ІНТЭРВ'Ю

МАСТАЦТВА ПАЧЫНАЕЦЦА СА ШКОЛЫ

З першага кастрычніка гэтага года Зэльвенская дзіцячая музычная школа набыла статус дзіцячай школы мастацтваў. У сувязі з гэтым дырэктар Зэльвенскай дзіцячай школы мастацтваў Уладзімір Сарокін адказаў на пытанні карэспандэнта "ГС".

— Уладзімір Канстанцінавіч, з чым звязаны змены, якія адбыліся з музычнай школай?

— Наша школа ўключана ў агульны план кіравання культуры па развіццю музычных навучальных устаноў. Згодна з гэтым планам, праз два гады нашай школе павінны былі прысвоіць статус дзіцячай школы мастацтваў. Надаўна ў распараджэнне музычнай школы быў аддадзены былы будынак канторы мясцовага быткамбіната. Са з'яўленнем будынка пашырыліся нашыя магчымасці, і мы змаглі адкрыць ў школе харэаграфічнае аддзяленне. Такім чынам, дзіцячая музычная школа ператварылася ў дзіцячую школу мастацтваў. Асабліва дапамаглі нам у гэтым начальнік кіравання культуры аблвыканкама Людміла Кадзевіч і загадчыца аддзела культуры Зэльвенскага райвыканкама Галіна Раманчук.

— Колькі дзяцей займаецца на харэаграфічным аддзяленні? Якія перспектывы адкрыюцца перад імі пасля заканчэння школы мастацтваў?

— На харэаграфічным аддзяленні цяпер займаюцца 17 чалавек. У асноўным, гэта вучні 3-4 класаў сярэдніх школ. Пакуль што мы набралі адну групу, хаця плануем арганізаваць дзве. Справа ў тым, што для заняткаў танцамі патрэбна спецыяльная зала. У новым нашым будынку памяшканне такое ёсць, але там неабходна зрабіць рамонт. Аддзел сацзабеспячэння выдзеліў на гэтыя мэты 5 мільёнаў рублёў. Таму рамонт — справа часу. Што тычыцца перспектыў, то пры наяўнасці ў выпускнікоў харэаграфічнага аддзялення жадання і здольнасцяў яны могуць паступіць у Гродзенскі каледж мастацтваў. Дарэчы, гэта навучальная ўстанова — адна з найлепшых такога роду ў рэспубліцы.

— Свет мастацтва — гэта не толькі музыка і харэаграфія. Ці плануецца ў школе мастацтваў адкрыццё яшчэ якога-небудзь аддзялення?

— Так. Мы хацелі ўжо ў гэтым навучальным годзе адкрыць аддзяленне выяўленчага мастацтва. Аднак, для гэтага патрэбна база. Ды і бацькам прыйдзецца набыць для сваіх дзяцей мальберт, фарбы, пэндзлі, паперу, а усё гэта каштуе грошай. Для выкладання выяўленчага мастацтва ў школе мастацтваў неабходны і спецыялісты адпаведнага ўзроўню. Усё ж такі ў наступным навучальным годзе мы плануем набраць групу на аддзяленне выяўленчага мастацтва.

— Уладзімір Канстанцінавіч, а колькі ў Зэльвенскай школе мастацтваў займаецца вучняў? Якія з музычных інструментаў карыстаюцца найбольшай папулярнасцю?

— На цяперашні момант у нашай школе займаецца 256 дзяцей. Найбольшая колькасць вучняў вучыцца іграць на баяне і фартэпіяна.

— Як часта вашыя выпускнікі звязваюць сваю будучую прафесію з музыкай?

— У гэтым годзе тры нашы выпускніцы паступілі на розныя аддзяленні музычнага вучылішча. У абласным каледжы мастацтваў займаецца чацвёра былых вучняў нашай музычнай школы, адзін выпускнік вучыцца ў кансерваторыі.

Наталля ГЛУШЭНЯ

МАСТЫ

ПАЦАВІЦКАЯ ТРАГЕДЫЯ

У вёсцы Пацавічы аўтамабіль збіў 53-гадовую жанчыну, якая ў вячэрні час рухалася па шашы.

Ад атрыманых траўм жанчына памерла на месцы. Падобныя трагедыі ў гэтай вёсцы адбываюцца ўжо на працягу трох гадоў.

КОНЬ НА ДАРОЗЕ

У вёсцы Струбніца перад рухаючымся аўтамабілем на шашу выбег конь.

Адбыўся наезд, у выніку якога аўтамабіль атрымаў пашкоджанні, а конь застаўся цэлым.

АРТЫСТЫ СТАЛІ ГЛЕДАЧАМІ

Артысты Мастоўскага народнага тэатра, які існуе пры раённым доме культуры, былі запрошаны ў Гродна на спектакль "П'ямонскі звер" па п'есе Андрэя Курэйчыка, якую паставіў абласны драмтэатр.

Гэты твор маладога беларускага драматурга ўпершыню быў інсцэніраваны ў Мастах рэжысёрам Мікалаем Гаўрылавым амаль год назад і меў поспех. На тэатральным аглядзе, які адбыўся сёлета ў Лідзе, спектакль і самадзейныя артысты ў некалькіх намінацыях мелі першынства. Раённы аддзел культуры, дзеля заахвочвання мясцовых артыстаў, арганізаваў паездку ў Гродна калектыву народнага тэатра і сплаціў усе выдаткі.

СВЕДКА СІВОЙ ДАЎНІНЫ

На беразе рэчкі Лунянкі, што ля вёскі Лунна, на месцы былога палаца-паркавага ансамбля Рэмарау расце магутная таполя. Абхват яе складае 6 метраў 34 сантыметры, што ў дыяметры прыкладна 2,02 метра.

Рэшткі самога парку былі знішчаны некалькі дзесяцігоддзяў назад пры пабудове новай школы. У гэтым парку любіла гуляць пісьменніца Эліза Ажэшка, якая часта наведвала маёнтак.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ДАРОЖНЫЯ ПРАБЛЕМЫ АДНАГО ДНЯ

Матаблок пашкодзіў "Мерседэс"

На праспекце Юнацтва, каля крамы "Верас", матаблок наехаў на аўтамашыну "Мерседэс". Аўтамабіль атрымаў нязначныя пашкоджанні.

Вучань наехаў на бабулю

Навучэнец вучэбнага камбіната райаграпрамтэхнікі, які праходзіў практычнае навучанне кіраваннем аўтамабілем, наехаў на жанчыну сталага веку, якая неспадзявана выбегла на шашу.

Бабуля атрымала нязначныя траўмы.

Веласіпедыст пацярпеў

У Мастах на вуліцы Леніна адбылося сутыкненне легкавога аўтамабіля з веласіпедыстам. Веласіпедыст атрымаў траўмы, а кіроўца легкавушкі з'ехаў з месца здарэння.

Атака на аўтамабіль

П'яны веласіпедыст сутыкнуўся з легкавым аўтамабілем маркі "Аўдзі". Аўтамашына засталася без бакавога люстэрка.

На гладкай дарозе

На вуліцы Савецкай насупраць крамы "Вясёлка" у аўтамабіля "Жыгулі" на ходу адвалілася пярэдняе кола.

Абышлося без ахвяраў.

Антон МАКЕЙ

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

ОБРАЗОВАНИЕ

АЛЬТЕРНАТИВНЫМ УЧЕБНИКАМ ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ МИНИСТР ПРЕДПОЧЁЛ БАЗОВЫЙ

Министр образования Беларуси Петр Бригадин отдает предпочтение базовому учебнику истории перед альтернативными. Об этом он заявил на пресс-конференции в Минске 1 ноября.



Министр культуры Леонид Гуляко и министр образования Петр Бригадин в президиуме внеочередного съезда Белорусского союза писателей, г. Минск, 24.09.2002 года

Министр сообщил, что в соответствии с решениями II съезда учителей и протоколом поручений президента страны, разработана программа издания учебников и учебных пособий по социально-гуманитарному циклу на период до 2005 года. В нынешнем году планируется выпустить около 50 изданий.

Говоря о подготовке учебников и пособий по истории Беларуси, министр отметил, что "выход каждого нового издания вызывает острые дискуссии в СМИ". "Мы получаем много замечаний и предложений, к которым относимся терпимо и пытаемся учесть при доработке", — сказал он. Учебники и пособия, считает Бригадин, "должны выполнять воспитательную функцию и нести детям свет. Причем, базовые издания, в которых излагается необходимый минимум знаний, должны соответствовать концепции преподавания истории и образовательным стандартам". По его словам, такой подход в издании учебников по истории основан на опыте Германии, США и России. "В этой стране, к примеру, из 10 альтернативных учебников по отечественной истории оставили в школе пока только три, а сейчас думают о создании базового издания, в котором, кроме авторского, представлены иные точки зрения на ту или иную проблему", — сказал министр. По его словам, в школах Беларуси сегодня действуют три учебника по отечественной истории, однако после доработки "будет взят за основу один или два".

В качестве образца изданий нового поколения Бригадин продемонстрировал сигнальный экземпляр учебника по истории средних веков для 5 класса под редакцией профессора Белорусского государственного университета Виктора Федосика. Этот учебник является "хорошо иллюстрированным, просто и увлекательно написанным компактным изданием",— заявил министр.

Марат ГОРЕВОЙ

ЭКОНОМИКА

В ОТОПИТЕЛЬНОМ СЕЗОНЕ ПЕРЕБОЕВ С ТОПЛИВОМ НЕ БУДЕТ

Перебоев с топливом в нынешнем отопительном сезоне в Беларуси не будет.

Об этом заявил сообщил министр жилищно-коммунального хозяйства Беларуси Александр Милькота на пресс-конференции в Минске.

> "... на данный момент мазута в стране имеется на 70 суток, печного бытового топлива — на 52 суток, каменного угля — на 230 суток..."
> **Александр Милькота**

По его словам, на данный момент, сообщил министр, мазута в стране имеется на 70 суток, печного бытового топлива — на 52 суток, каменного угля — на 230 суток; есть также большие запасы дров.

По словам Милькоты, задолженность предприятий и организаций бюджетной сферы республиканского и местного подчинения перед Минжилкомхозом составляет в целом порядка 87 млрд. рублей. Задолженность по лицевым счетам имеют 13,4 процентов населения Беларуси.

Ежегодно в среднем 12 процентов населения имеют задолженность по оплате за коммунальные услуги. "Мы считаем, что это нормально и строгие меры принимаем крайне редко", — отметил министр.

По его словам, в рассматриваемом бюджете на 2003 год предусмотрено, что потребители будут оплачивать 50 процентов стоимости отопления (сейчас — 40).

До конца отопительного сезона увеличение тарифов "кроме возможной индексации, связанной с инфляцией, не более чем на 1,5 процента", не планируется, сообщил министр.

Напомним, что в октябре в Беларуси продолжился рост тарифов на жилищно-коммунальные услуги для населения.

На 2,9 процента возросла квартплата (плата за техобслуживание), на столько же подорожали газ, горячая и холодная вода.

С начала года квартплата увеличилась в 5,64 раза (за весь 2001 год — на 38,5 процента), плата за пользование лифтом — в 8 раз (в 1,85 раза). Отопление подорожало в 2,43 раза, горячая вода — в 2,42, газ — на 95,7 процента, холодная вода и канализация — на 55,1, вывоз отходов — на 50,4, обезвреживание отходов — на 24,6; плата за пользование радиоточкой возросла на 51,4 процента.

БелаПАН

ОПРОС

В БЕЛАРУСИ ТЕРАКТЫ ВОЗМОЖНЫ

